# ІНСТЫТУТ І ЎСТАНОВЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

За гады свайго існавання Віцебскі медыцынскі інстытут выпусціў каля двух тысяч урачоў. Яго выхаванцы працуюць у розных кутках рэспублікі. Многія з іх зарэкамендавалі сябе добрымі спецыялістамі і арганізатарамі аховы здароўя.

З пачуццём глыбокай павагі гавораць працоўныя аб рабоце загадчыка хірургічнага аддзялення Лепельскай бальніцы тав. Нікалаенка. Любоўю і павагай насельніцтва карыстаюцца загадчык Нова-Тухінскага ўрачэбнага ўчастка Дубровенскага раёна тав. Сутко, хірург Бешанковіцкай раённай бальніцы тав. Блау, урачы Астровенскай участковай бальніцы тт. Феўралёў і Феўралёва і многія іншыя.

У інстытуце ўстанавілася добрая традыцыя не забываць сваіх выпускнікоў, падтрымліваць з імі сувязь і дапамагаць у практычнай рабоце. Гэтая сувязь інстытута са сваімі выхаванцамі ажыццяўляецца перш за ўсё праз навукова-кансультацыйнае бюро. Маладыя ўрачы прысылаюць сюды для кансультацыі гісторыі хвароб, просяць рэкамендаваць навуковую літаратуру па розных пытаннях медыцыны і аховы здароўя і г. д. На гэтыя пісьмы дырэкцыя і прафесарска-выкладчыцкі склад інстытута даюць уважлівыя адказы. Вялікую дапамогу парадамі і кансультацыямі аказваюць маладым урачам прафесары тт. Гофман, Аляшкевіч, Цвіліхоўская, Гольдман, выкладчыкі тт. Мітрашэнка, Сасновік, Лур'е, Смердаў, Дзянісава і іншыя.

Супрацоўнікі інстытута выязджаюць таксама непасрэдна па ўрачэбныя ўчасткі, дзе працуюць іх выхаванцы.

У мінулым годзе ў сельскія ўрачэбныя ўчасткі Віцебскай вобласці было арганізавана 42 выезды работнікаў кафедраў інстытута. У час гэтых выездаў маладым урачам было дадзена многа практычных парад. Такая сувязь у значнай ступені садзейнічае павышэнню кваліфікацыі ўрачоў і паляпшэнню арганізацыі аховы здароўя.

Пэўную работу праводзіць інстытут па павышэнню кваліфікацыі работнікаў раённых бальніц і сельскіх урачэбных участкаў.

З 1948 года ў клініках нашага інстытута прайшлі спецыялізацыю 370 урачоў. Сістэматычна гэтую работу вядуць навуковыя супрацоўнікі клінік акушэрства і гінекалогіі, шпітальнай хірургіі і агульнай хірургіі. Асабліва многа ўрачоў прайшлі спецыялізацыю па тэрапіі, хірургіі, акушэрству і гінекалогіі, вочных і нервовых хваробах.

Акрамя таго, інстытут аказвае непасрэдную кваліфікаваную медыцынскую дапамогу насельніцтву. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў праводзіць кансультацыі ва ўсіх лячэбна-прафілактычных установах Віцебска, у раённых і сельскіх бальніцах вобласці. Выезды праводзяцца планавыя і экстраныя. Толькі за 9 месяцаў 1955 года пракансультавана звыш 4 тысяч хворых. Праведзена дыспансерызацыя калгаснікаў падшэфнага калгаса «Чырвоны партызан» і ўсебаковы медыцынскі агляд работнікаў Астровенскай МТС.

Адной з форм дапамогі ўрачам з'яўляецца прапаганда важнейшых дасягненняў медыцынскай навукі. Супрацоўнікі інстытута выступалі з дакладамі на абласных семінарах па хірургіі, тэрапіі, педыятрыі, анкалогіі, на курсах па акушэрству і гінекалогіі, на раённых канферэнцыях урачоў у Суражы, Чашніках, Асвеі, Лепелі, Дуброўне, Лёзне і іншых раённых цэнтрах.

Сур'ёзны ўклад у паляпшэнне работы ўстаноў аховы здароўя ўносяць вучоныя інстытута, якія вядуць навукова-даследчую работу па актуальных пытаннях тэорыі і практыкі медыцыны.

На кафедры біялогіі, якой загадвае прафесар Шапот, праводзяцца эксперыментальныя даследаванні з радыёактыўнымі ізатопамі для выяўлення сутнасці знясілення нервовых цэнтраў. Даследаванні навукова абгрунтоўваюць найбольш эфектыўную тэрапію пры гэтай хваробе. На падставе вялікага матэрыялу зроблен важны вывад аб вялікай эфектыўнасці комплекснай тэрапіі, якая заключаецца ў спалучэнні ўдыхання кіслароду і соннай тэрапіі пры ўмове ўзмоцненага забеспячэння вітамінамі. Комплексная тэрапія дала станоўчы эфект пры лячэнні парушэння кровазвароту галаўнога мозгу, гіпертаніі і іншых захворванняў. Распрацаваны метад укараняецца ў клінічную практыку.

На кафедры шпітальнай хірургіі, якой загадвае прафесар Аляшкевіч, распрацоўваюцца найбольш рацыянальныя метады лячэння апёкаў і барацьбы са спаечным працэсам у брушной поласці. Прафесар Гольдман прапанаваў бульбяны сок для лячэння язвеннай хваробы.

Інстытут выпусціў чатыры зборнікі, у якіх надрукавана больш 200 навуковых работ. Звыш 60 навуковых работ надрукавана ў саюзных медыцынскіх часопісах.

Раённыя бальніцы ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі спецыялістамі, якія закончылі клінічную ардынатуру, што значна палепшыла медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Трэба, аднак, сказаць, што база інстытута недастаткова выкарыстоўваецца органамі аховы здароўя для падрыхтоўкі клінічных ардынатараў. Кафедры маюць магчымасць выпускаць іх значна больш.

Мерапрыемствы, якія праводзіць інстытут, садзейнічаюць павышэнню прафесіянальнага майстэрства ўрачоў, з'яўляюцца важным фактарам паляпшэння медыцынскага абслугоўвання працаўнікоў горада і вёскі.

**І. БАГДАНОВІЧ,**
**дырэктар Віцебскага медыцынскага інстытута.**